Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 18 (28382)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Уклад рублёвы ці валютны?**

СТАР. 4



**Зіма. Студзень. Каляды**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Вельмі жорстка пастаўлена патрабаванне, і яно павінна выконвацца: ніякіх набораў з боку школ, настаўнікаў быць не павінна. Гэта будзе карацца вельмі строга. Дзяржава выдзяляе сродкі на ўтрыманне навучальных устаноў. І калі бацькі хочуць чымсьці дапамагчы, выходзяць з ініцыятывай — гэта адно, у адваротным выпадку — не павінна быць злоўжыванняў у гэтым пытанні».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9321 | ▲ |
| Еўра | 2,0741 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Жывая памяць

## У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Мірскім замку было гета, дзе загінула каля 650 чалавек




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Для некаторых беларусаў, а асабліва тых, чые карані вядуць на Навагрудчыну, Мірскі замак рэдка суадносіцца з гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Гэты велічны прыгожы будынак, вядомы далёка за межамі нашай краіны, у першую чаргу з'яўляецца для іх месцам, дзе загінулі вельмі блізкія людзі.**

У 20-я гады мінулага стагоддзя ў Міры пражывала звыш 3300 яўрэяў, што складала прыкладна палову ад усяго насельніцтва. Гэта і стала адной з прычын трагедый, якія адна за адной навальваліся на мястэчка.

СТАР. 13

■ На слыху

## Галоўны прынцып — добраахвотнасць

**«Вяртанне да школьнай шасцідзёнкі — гэта ўчарашні дзень», «назад у мінулае», «дайце дзецям і настаўнікам адпачыць два дні», «на дзіця ўжо ў пятніцу без слёз глядзець немагчыма», «цяпер педагогаў зноў будуць караць за нізкую наведвальнасць мерапрыемстваў у школьную суботу» — прыкладна так каментавалі загад Міністэрства адукацыі «Аб удасканаленні арганізацыі шостага школьнага дня» ў сецівe ўвесь тыдзень.**

Каб абвергнуць бацькоўскія апасенні, Міністэрства адукацыі размясціла на сваім сайце афіцыйны каментарый, у якім сцвярджаецца, што наведванне шостага школьнага дня будзе для навучэнцаў добраахвотным. Па-ранейшаму ў школах і гімназіях будуць праводзіцца фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы, гульні, спартакіяды, спаборніцтвы, заняткі аб'яднанняў па інтарэсах спартыўнай накіраванасці. Максімальна занятымі ў мерапрыемствах шостага школьнага дня павінны быць навучэнцы, якія патрабуюць асаблівай педагагічнай увагі.

Што датычыцца больш актыўнага ўключэння ў шосты школьны дзень педагогаў-прадметнікаў, мяркуецца, што кіраўнікі ўстаноў адукацыі, як і раней, будуць планаваць расклад шостага школьнага дня з улікам арганізацыі факультатыўных заняткаў для вучняў 9 — 11 класаў, стымулюючых заняткаў — для адораных і таленавітых дзяцей і падтрымліваючых — для дзяцей са слабай паспяховасцю. Мяркуецца, што правядзенне для навучэнцаў 9 — 11 класаў дадатковых заняткаў менавіта ў гэты дзень разгрузіць асноўны вучэбны тыдзень. Таксама па суботах настаўнікі-прадметнікі могуць арганізоўваць інтэлектуальныя конкурсы, навукова-практычныя канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы.

Асаблівая ўвага ў загадзе ўдзяляецца ўзаемадзеянню з сям'ёй. «Бацькі, пры неабходнасці, змогуць наведаць у суботу кансультацыі, сустрэцца з педагогамі-прадметнікамі, абмеркаваць пытанні, якія яны не могуць вырашыць з прычыны сваёй занятасці ў будныя дні», — адзначаецца ў каментарыі.

СТАР. 3

■ Уласная справа

## СЁННЯ — БЕСПРАЦОЎНЫ, ЗАЎТРА — ПРАДПРЫМАЛЬНІК

### Як у невялікім гарадку паспяхова адкрыць сваю фірму

**Сёння эканамічны поспех краіны шмат у чым залежыць ад таго, наколькі развітае ў ёй малое і сярэдняе прадпрымальніцтва. У 2014 годзе яго доля ў ВУП Беларусі склала 30%. Да 2020-га гэты паказчык плануецца павысіць да 40%. Аднак адна справа пачынаць уласны бізнес у сталіцы, маючы досыць грошай і папярэдні досвед. А калі да таго займаўся іншым, не маеш працы і жывеш у горадзе, у якім менш за 10 тысяч чалавек?**



У такім выпадку залатых гор адразу чакаць не варта, бо ў невялікіх населеных пунктах пакупная здольнасць насельніцтва ніжэйшая, чым у буйных гарадах. Але з іншага боку — выдаткі на рэкламу скароціць сарафаннае радыё (усе ж ведаюць адзін аднаго). Часта некаторыя нішы на рынку застаюцца ўвогуле незанятымі, і таму першы час можна працаваць, не баючыся канкурэнцыі.

СТАР. 4

# ДЗЯРЖАВА РАЗЛІЧВАЕ НА ВУЧОНЫХ

**Цяжкія задачы ў эканоміцы можна вырашыць, толькі аб'яднаўшыся, заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас размовы з навуковымі і навукова-педагагічнымі работнікамі пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў доктара навук і атэстатаў прафесара, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

«Нам незалежнасць вельмі танна дасталася: усе народы ваявалі, сёння ваюе наша брацкая Украіна. Нам нельга дапусціць таго, каб ваявалі. Мы народ міралюбівы. Напэўна, Бог перад намі паставіў гэтыя цяжкія задачы, каб мы адчувалі, што такое незалежнасць. Пераадолець усё гэта мы можам, толькі аб'яднаўшыся. І, дзякуй богу, галоўны напрамак нашай барацьбы за незалежнасць праходзіць праз эканоміку — не ў ваенная сферы, не ў палітычнай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таму, падкрэсліў Прэзідэнт, неабходна паскоранымі тэмпамі займацца развіццём эканомікі, і навука тут павінна быць галоўным складнікам. «Таму чакайце вельмі сур'ёзнага націску з майго боку ў сферы навукі. Нам не патрэбна проста навука, якая нават калі і не за бюджэтныя грошы жыве, то проста існуе. Нам патрэбна эфектыўная навука для вытворчасці», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

## Без навукі мы нічога зрабіць не можам

«Хачу, каб вы разумелі — будучыня краіны сёння ў вашых руках», — заявіў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў: «У нас няма геапалітычных амбіцый, самае галоўнае для нас — зберагчы гэты кавалачак зямлі. Усе праблемы ў сувязі з гэтым, як ні дзіўна, ляжаць у сферы эканомікі. Эканоміка ў нас абсалютна адкрытая. І нам трэба яе захаваць у самай жорсткай канкурэнтнай барацьбе. А канкурэнцыі без навукі не бывае». Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на той факт, што цяпер беларускія тэхналогіі, прадукцыя запатрабаваны, але трэба глядзець наперад і рухацца далей, пашыраць рынкі збыту.

Прэзідэнт закрануў праведзеныя візіты ў Егіпет і Судан, асноўнай мэтай якіх было пашырэнне паставак туды беларускай прадукцыі і прыцягненне беларускіх тэхналогій. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што існуюць велізарныя магчымасці для экспарту ў афрыканскія дзяржавы тэхналогій і прадукцыі, шырокага выкарыстання там беларускага вопыту. І гэтыя магчымасці неабходна актыўна выкарыстоўваць, каб не ўпусціць час. «У нас ёсць тэхналогіі, і яны сёння запатрабаваны. Але заўтра спатрэбіцца іншыя, новыя тэхналогіі. Без навукі ні ў сябе, ні на знешніх рынках мы нічога зрабіць не можам. Менавіта таму такія высокія патрабаванні выстаўляюцца да вучоных», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Паляпшэнне якасці жыцця людзей немагчыма без інавацый

«Менавіта з перадавымі распрацоўкамі непасрэдна звязаны рост нашага дабрабыту і інтэлектуальнае развіццё нацыі, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — Яны вызначаюць у канчатковым выніку ўзровень эканамічнай канкурэнтаздольнасці дзяржавы на міжнароднай арэне. Больш таго — гарантуюць яе палітычную вагу ў свеце». Паводле слоў Прэзідэнта, асаблівую актуальнасць набывае ўкараненне зялёных тэхналогій, другаснае выкарыстанне рэсурсаў, энергазберажэнне. «Гэта не проста модны агульнасусветны трэнд, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Тут і здароўе грамадзян, і ўстойлівае гарманічнае развіццё нашых тэрыторый».

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што трэба «крытычна і рацыянальна, па-дзелавому зірнуць на эфектыўнасць дзеючай мадэлі кіравання навукай у нашай краіне». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта сустрэча — прэлюдыя да вялікай размовы, якая адбудзецца ў Нацыянальнай акадэміі навук. «Мы павінны вельмі сур'ёзна прааналізаваць сітуацыю ў навуцы, пагаварыць пра яе сучаснае і будучае», — заявіў Прэзідэнт. На яго думку, ёсць нямала задач, якія неабходна вырашыць. «Нейкія з іх вы можаце і павінны абазначыць у ходзе сённяшняй размовы. Акрамя таго, на маючай адбыцца ў бліжэйшы час маштабнай нарадзе па развіцці навуковай сферы мы зможам разам з вамі распавесці, як мы маглі б развіць усе вашы прапановы і, можа, нават вырашыць некаторыя з іх. Таму заклікаю вас прыняць самы дзейны ўдзел у падрыхтоўцы гэтага мерапрыемства — патрэбны свежыя ідэі і ініцыятывы», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Напярэдадні Дня беларускай навукі ён выказаў словы ўдзячнасці вучоным за праведзеную імі вялікую работу, а таксама ўручыў дыпломы і атэстаты. Звяртаючыся да прысутных, Прэзідэнт заклікаў: «Зрабіце так, каб грамадства адчувала і ведала не толькі тое, што ў нас ёсць вучоныя, але і што яны здольны на штосьці вялікае. Важна, каб гэты год сапраўды прагучаў як Год навукі».

## Лепшыя навуковыя распрацоўкі — на службу людзям

Кіраўнік дзяржавы падчас сустрэчы з вучонымі асаблівую ўвагу ўдзяліў нявырашаным пытанням, якія існуюць у галіне. «Некаторыя з іх сапраўды насцярожваюць», — заўважыў Прэзідэнт. На яго думку, далёка не заўсёды запатрабаваны эканомікай спецыяльнасці, па якіх рыхтуюць саіскальнікаў вучоных ступеняў. Гэта відавочная недапрацоўка ўсіх, хто ажыццяўляе планаванне ў гэтай галіне.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, зроблена, вядома, шмат. Але разам з тым так і не ўдалося дабіцца, каб усе даследаванні як па тэхнічных і прыродазнаўчанавуковых, так і па гуманітарных дысцыплінах мелі прыкладную значнасць. «Вучоных неабходна нацэльваць на самыя запатрабаваныя тэмы і напрамкі. Лепшыя распрацоўкі павінны служыць людзям, а не пыліцца на паліцах, — заявіў Прэзідэнт. — І па гэтым пытанні мною прынята вычарпальнае, радыкальнае рашэнне, і яно залежыць толькі ад вас». «Ніхто сёння ў краіне не можа адмовіцца ад асваення або ўкаранення вынікаў навуковых даследаванняў. І калі гэтага ўкаранення няма, значыць, вінаваты кіраўнік Акадэміі навук і ўсе інстытуты, міністр адукацыі, людзі, якія курыруюць гэты напрамак ва ўрадзе. Вінаватыя толькі яны. Не маюць права работнікі вытворчасці адмовіцца ад перспектыўных распрацовак. Перспектыўныя ці не, вырашае фактычна кіраўнік Акадэміі навук, і ён нясе за гэта адказнасць.

Таму гэта пытанне вырашана раз і назаўсёды, і вы, вучоныя, яго больш не ўзнімайце перада мною. Ёсць спецыялісты, якія ацэньваюць перспектыўнасць распрацовак», — сказаў кіраўнік дзяржавы. У ліку іншых вострых праблем Аляксандр Лукашэнка назваў нежаданне таленавітай моладзі будаваць кар'еру ў даследчай сферы. «Паглядзіце, у нас шэраг перспектыўных галін патрабуе актыўнага развіцця. Атамная энергетыка, касмічная і біятэхналагічная галіны — тут шырокае поле дзейнасці для здольных маладых людзей. Я называю новыя галіны, а колькі старых, якім можна даць новае дыханне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама задаў рытарычнае пытанне: «Ці можам мы сёння задаволіць здаровыя навуковыя амбіцыі таленавітай моладзі і прадаставіць для работы патрэбныя ўмовы?» На думку Прэзідэнта, у навуковай галіне існуе яшчэ нямала задач, якія трэба вырашыць.

## Навука павінна служыць яшчэ і апорай дзяржаўнай ідэалогіі

На цырымоніі ўручэння дыпломаў доктара навук і атэстатаў прафесара навуковым і педагагічным работнікам кіраўнік дзяржавы заявіў, што нам проста неабходна аргументаванае, непрадузятае меркаванне кампетэнтных спецыялістаў. «Асабліва сёння, калі робяцца асобныя спробы паставіць пад сумненне суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы», — лічыць ён. Прэзідэнт звярнуў увагу на той факт, што ў гэтай зале знаходзяцца людзі, распрацоўкі якіх ужо ўкаранёны і паказваюць высокія вынікі ў важных і запатрабаваных сферах жыцця нашага грамадства.

«Прысутнасць тут і зусім маладых вучоных азначае, што ў нас створана нямала магчымасцяў для дасягнення поспеху ў любым узросце. Трэба толькі прыкласці працу і талент», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Звяртаючыся да вучоных, ён падкрэсліў: «Усе вы ўжо праявілі сябе і заслужылі высокую ацэнку калег.

Дзейнічайце, стварайце, вынаходзьце, і калі прадукт вашай творчасці будзе канкурэнтаздольным, вы можаце разлічваць на поўную падтрымку і маю, і дзяржавы. Няхай прызнанне будзе стымулам для новых навуковых перамог і здзяйсненняў, і абавязкова ў нашай роднай Беларусі, дзе выбудавана і пастаянна ўдасканальваецца сістэма дзяржаўнай падтрымкі навукі і вучоных».

■ Парламенцкі дзённік

# КЛЮЧАВЫ ПАРТНЁР НА БАЛКАНАХ

**Кіраўнікі абедзвюх палат беларускага парламента сустрэліся з Аляксандрам ВУЧЫЧАМ, старшынёй урада Сербіі, які знаходзіцца ў нашай краіне з афіцыйным візітам. Асноўныя тэмы, што абмяркоўваліся, — развіццё парламенцкага ўзаемадзеяння, а таксама сувязяў у эканамічнай, банкаўскай, прамысловай і іншых сферах.**

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў**, звярнуў увагу, што Сербія — наш ключавы партнёр на Балканах.

— Пра гэта кажуць і тыя добрыя адносіны, якія склаліся паміж лідарамі нашых дзяржаў, і ўзаемная падтрымка на міжнародных пляцоўках, — адзначыў ён. — Упэўнены, што і парламенцкая дыпламатыя павінна адыграць выключную ролю ў развіцці ўзаемавыгадных сувязяў паміж нашымі краінамі.

Па словах спікера ніжняй палаты, міжпарламенцкі дыялог апошнімі гадамі набірае дастаткова добрыя абароты, мы выходзім на новыя формы супрацоўніцтва. Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў правесці сумесныя пасяджэнні парламентарыяў, што ўваходзяць у групы сяброўства.

— Прыемна адзначыць, што ў нас захоўваецца добрая традыцыя па стварэнні груп сяброўства. У парламенце Сербіі ў такую групу, наколькі я ведаю, уваходзіць 117 дэпутатаў. Гэта кажа пра тое, што дэпутаты праяўляюць вялікую цікавасць да Рэспублікі Беларусь.

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі**, дадаў, што напрамак для ўзаемадзеяння, які мае добрыя перспектывы, — гэта супрацоўніцтва ў банкаўскай сферы.

— Наша заканадаўства дазваляе крэдытаваць замежнага імпарцёра. Банк развіцця Беларусі выходзіў з адпаведнымі прапановамі, пакуль гэты праект не адбыўся. Мы былі б удзячныя, калі б вы далі даручэнні па развіцці экспартнага крэдытавання.

Старшыня верхняй палаты адзначыў, што добрыя перспектывы ёсць па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

— Сёння ў нас пяць сумесных праектаў: у галіне нана- і біяструктур, лічбавых выяў, ідзе работа над стварэннем радонавых картаў, ацэнкай доз апраменьвання.

Кіраўнік сербскага ўрада падзякаваў за цёплую сустрэчу і прызнаўся, што стаўленне сербскага народа да беларускага ўяўляе сабой сумесь любові і павагі.

— Я ўпэўнены, што ні адзін народ у Еўропе не адчувае такога да беларускага народа, — я кажу пра краіны Еўрапейскага саюза.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Смяротнае пакаранне абмяркуюць на слуханнях

**Прапрацоўваецца магчымасць правядзення парламенцкіх слуханняў па пытанні смяротнага пакарання ў Беларусі ў пачатку 2018 года, заявіў падчас брыфінгу ў Палаце прадстаўнікоў старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Андрэй НАВУМОВІЧ.**

«Мы плануем у пачатку наступнага года выйсці на парламенцкія слуханні ў гэтым пытанні», — сказаў ён. «Каб выйсці на абмеркаванне дадзенага пытання, трэба досыць сур'ёзна прапрацаваць яго з новым дэпутацкім скліканнем. За гэты адрэзак часу я знайду магчымасць сустрэцца з кожным дэпутатам, перагаварыць, пачуць... Трэба, каб дэпутаты ў сваіх акругах абмеркавалі гэтае пытанне. Такая папярэдняя праца дасць магчымасць выйсці затым на парламенцкія слуханні», — адзначыў Андрэй Навумовіч ■

■ Ва ўрадзе

# ПЛАНКА Ў ПАЎМІЛЬЯРДА

### Варта пераходзіць да паглыбленага супрацоўніцтва з Сербіяй

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ лічыць рэальным павялічыць тавараварот з Сербіяй да 500 мільёнаў долараў. Пра гэта кіраўнік Савета Міністраў заявіў падчас сустрэчы са старшынёй урада Сербіі Аляксандрам ВУЧЫЧАМ.**



Фота БЕЛТА.

За сем гадоў у рамках рэжыму свабоднага гандлю тавараварот Беларусі і Сербіі павялічыўся амаль у пяць разоў, перавысіўшы ў 2015 годзе 250 мільёнаў долараў. «У 2016 годзе ва ўмовах няпростай эканамічнай сітуацыі нашы паказчыкі значна знізіліся. Аднак патэнцыял эканомік дазваляе выйсці на больш інтэнсіўны ўзровень эканамічнага ўзаемадзеяння. Нарасціць тавараварот з Сербіяй да 500 мільёнаў долараў у наступныя гады — гэта рэальная планка двухбаковага супрацоўніцтва», — лічыць Андрэй Кабякоў.

Для гэтага Беларусь прапануе ад гандлю пераходзіць да паглыбленага інвестыцыйнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Паводле слоў прэм'ера, сумесныя прадпрыемствы і праекты дазволяць выкарыстаць перавагі кожнага з бакоў і атрымаць вялікія прыбыткі.

«Беларусь нацэлена на доўгатэрміновае супрацоўніцтва з Сербіяй. Са свайго боку мы імкнёмся ўлічваць інтарэсы Сербіі і забяспечваць максімальную лакалізацыю сумесна вырабленага прадукту», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

■ Сувязі

# Лекі па найлепшых тэхналогіях

### Партнёрства з Індыяй у медыцынскай сферы будзе пашырацца

**Індыя зацікаўлена ў інвестыцыйнай дзейнасці ў Беларусі і стварэнні вытворчасцяў на нашай тэрыторыі. Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў нашай дзяржаве спадар Саксена ПАНКАДЖ.**

У мінулым годзе Індыя стварыла тры сумесныя прадпрыемствы ў Беларусі па вытворчасці медпрэпаратаў, у тым ліку па лячэнні раку і СНІДу. Дарэчы, менавіта Індыя — адзін з сусветных фармацэўтычных лідараў па вырабе падобных прэпаратаў. Спадар Саксена Панкадж лічыць, што ў перспектыве беларуска-індыйскае супрацоўніцтва ў гэтай і іншых сферах будзе пашырацца.

Таксама дыпламат паведаміў, што Індыя запрашае Беларусь актыўна ўдзельнічаць у праграме «Рабі ў Індыі». Паводле яго слоў, гэта праграма створана для прыцягнення патэнцыялу замежных краін у Індыю. «Індыя запрашае ствараць вытворчасці. Беларусь прывабная для нас высокімі тэхналогіямі, сельскагаспадарчай вытворчасцю, выпускам велікагрузных тэхнікі і можа стаць партнёрам гэтай індыйскай праграмы», — перакананы пасол. Ён звярнуў увагу на той факт, што гэтыя пытанні абмяркоўваліся, у тым ліку ў час візітаў і перагавораў, на вышэйшым і высокім узроўнях. Як лічыць спадар Саксена Панкадж, такія кантакты садзейнічаюць істотнаму нарошчванню двухбаковых адносін.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by* ■

■ За падзеяй

Прэзентаваны ўнікальны альбом, дзе прадстаўлена мастацтва Міншчыны

# КРАЙ, ЯКІ НАТХНЯЕ

**Васіль Шаранговіч, Уладзімір Слабодчыкаў, Барыс Цітовіч, Алесь Квяткоўскі... Гэтых творцаў яднае не толькі тое, што яны знайшлі свой жыццёвы шлях у мастацтве, але і зямля, на якой яны нарадзіліся і жывуць. Пад вокладкай унікальнага альбома «Рукою майстра» сабраныя рэпрадукцыі, фотаздымкі работ творцаў з Міншчыны. Кніга пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда» пры падтрымцы Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

— Міншчына мастацкая — выдатны творчы край, — адзначыў падчас прэзентацыі **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Калі б кніга была прысвечаная не толькі сучасным мастакам, але і мастацтву вобласці ў цэлым, то мы маглі б тут убачыць рэпрадукцыі вялікіх творцаў. Прасторы Стаўбцоўшчыны, Мядзельшчыны, Вілейшчыны занатаваны ў творах мастакоў XIX — першай паловы XX стагоддзя. Спадзяюся, што Выдавецкі дом «Звязда» будзе мець дачыненне да новых падобных праектаў.

Альбом «Рукою майстра» стаў першым у нашай краіне выданнем, якое прэзентуе мастацтва рэгіёна — ураджэнцаў пэўнай вобласці.

— Дзякуючы выданню сучаснае мастацтва можа сябе прапагандаваць і паказваць. Мы шмат гадоў марылі пра тое, што творы мастакоў будуць з'яўляцца не толькі ў галерэях і музеях, што мастакі і іх работы будуць заўважаныя, яны будуць друкавацца не толькі на старонках газет і часопісаў, але будуць выходзіць кнігі, выдавацца альбомы, — заўважыла **мастацтвазнаўца Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Гэты альбом — вельмі важны крок. Адметна, што Міншчына стала першай вобласцю, якая паверыла ў мастацтва і зрабіла кнігу-прэзентацыю.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ПРАМЫЯ ЛІНІІ

## УСЁ АБ ЖЫЛЛЁВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ

Ці падлягае падаткаабкладанню падораная кватэра? Ці можна прадаць кватэру, пабудаваную з дапамогай льготнага крэдытавання? Як падзяліць асабовыя рахункі? Што рабіць, калі суседзі пастаянна шумяць? Ці магчыма выселіць уласніка з кватэры?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой тэлефоннай лініі госцю нашай рэдакцыі — **адвакату спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі №3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлане КАСЦЕВІЧ.**

Прамая лінія пройдзе 2 лютага з 11 да 12 гадзін. Наш тэлефон 8 (017) 287-18-71.

***Папярэднія пытанні можаце задаваць 31 студзеня і 1 лютага па тэлефоне 8 (017) 287-18-29 у працоўны час альбо 2 лютага з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71. Або можаце даслаць свае пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by ці па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.***

## УНУТРАНЫЯ ВОЙСКІ — НА СУВЯЗІ

У гэтую суботу, **28 студзеня, адбудзецца прамая тэлефонная лінія з намеснікам міністра ўнутраных спраў — камандуючым унутранымі войскамі генерал-маёрам Юрыем Хаджымуратавічам КАРАЕВЫМ.** Звярнуцца са сваімі пытаннямі можна **з 9.00 да 12.00** па тэлефонах **(8-017) 223-84-28, (8-017) 223-76-64.**

Сярод асноўных тэм — развіццё ўнутраных войск, спецыфіка выконваемых імі службова-баявых задач, парадак прызыву на тэрміновую службу і службу па кантракце, навучанне на факультэце ўнутраных войск Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, у ходзе прамой тэлефоннай лініі можна будзе абмеркаваць праблемы, якія ўзніклі падчас службы.

Газета «Звязда» заўсёды імкнецца да таго, каб асвятляць самыя актуальныя і важныя тэмы, якія сапраўды закранаюць нашых чытачоў. Прамыя лініі — эфектыўны спосаб для кожнага быць пачутым, а адказы на хвалюючыя пытанні можна будзе знайсці на старонках нашага выдання.

■ Крокі да Шагала

# ХТО НАВУЧЫЎ МАЙСТРА ГРАФІЦЫ?

**«Звязда» працягвае серыю публікацый, прысвечаных юбілею Марка Шагала. 130-годдзе з дня нараджэння сусветна вядомага мастака будзе адзначацца 7 ліпеня. У віцебскім музеі Шагала днямі аб'явілі пра афіцыйны пачатак святочных мерапрыемстваў.**



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Калекцыянер Уладзімір БАГДАНАЎ і дырэктар музея Шагала ў Віцебску Ірына ВОРАНАВА.

Цяпер тут, упершыню ў краіне, можна пазнаёміцца з творчасцю аднаго з настаўнікаў Шагала. Дзякуючы нямецкаму мастаку-гравёру Герману Штруку, наш славуты зямляк стаў графікам. Спадар Штрук вучыўся ў Берлінскай акадэміі мастацтваў і там жа пасля выкладаў. Ён у пэўным сэнсе абнавіў гравёрнае мастацтва: уносіў у яго імправізацыю. Вядомы і тым, што выпрацаваў уласную тэхніку, па-майстэрску спалучаючы розныя прыёмы гравіравання. Гэта давала новыя магчымасці ўвасаблення партрэта і пейзажа. Напісаная ім кніга аб мастацтве гравюры мела вялікі поспех.

Цікава, што Герман Штрук маляваў Беларусь падчас Першай сусветнай вайны.

— Ён зрабіў замалёўкі будынкаў, тутэйшых жыхароў, калі знаходзіўся ў Беларусі, Літве і Курляндыі. І што цікава, не толькі па ўласнай ініцыятыве, а па загадзе камандавання. Падчас той вайны гэта актыўна практыкавалася, — расказвае **калекцыянер Уладзімір БАГДАНАЎ.**

Дзякуючы Штруку, можна, у прыватнасці, убачыць, якімі былі Гродна, Ліда, як выглядалі жыхары яўрэйскіх мястэчак.

— Тады немцы ставіліся да яўрэяў не горш, чым да беларусаў, літоўцаў, эстонцаў і іншых. Дзятве паказвалі кіно, — удакладняе суразмоўца.

47 арыгінальных чорна-белых літаграфій Германа Штрука, датаваных 1916 годам, калекцыянер набыў на аўкцыёне. Творчасць менавіта гэтага мастака зацікавіла Уладзіміра Багданава з-за таго, што той навучыў Шагала рабіць афорты. Уладзімір падарыў віцебскаму музею кнігу з работамі Штрука, выдадзеную ў 1916 годзе ў Берліне.

У музеі падкрэсліваюць, што імя Германа Штрука (гады жыцця: 1876—1944) цесна звязана з Маркам Шагалам.

— Вядома, што яны пазнаёміліся ў Берліне ў 1922 годзе. Літаральна за тыдзень Шагал як добры вучань авалодаў тэхнікай афорта. І з ашаламляльным вынікам пачаў ствараць гравюры. Яго першым вопытам у гэтай тэхніцы сталі ілюстрацыі да аўтабіяграфічнай кнігі «Маё жыццё». Вучоба ў Германа Штрука дазволіла Шагалу ажыццявіць даўнюю мару — асвоіць розныя графічныя тэхнікі. Пасля ён пісаў: «Мне здаецца, што мне чагосьці не хапала, калі б я, пакінуўшы ўбаку колер, не заняўся ў пэўны момант жыцця гравюрай і літаграфіяй», — расказвае **дырэктар музея Ірына ВОРАНАВА.**

Адну з першых работ «Бабуля» Шагал падарыў настаўніку. Апошні сам яе выбраў, ацэньваючы графічныя пачынанні вучня. Між іншым, яе можна ўбачыць у Віцебску. Твор падарыў гораду мецэнат з Германіі доктар Генрых Мандэль, які купіў яго ў Штрука. Дзіўная гісторыя «кругавароту афорта».

Выстава будзе працаваць па 12 лютага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Надвор'е

# МОКРЫ СНЕГ З ДАЖДЖОМ

## На выхадныя —туманы і галалёдзіца

**Да канца тыдня на тэрыторыю Беларусі завітае чарговая адліга, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Ужо ў пятніцу ў краіне пачнуць гаспадарыць атмасферныя франты, якія рухаюцца з паўночнага захаду Еўропы. Яны прынясуць нам цёплае і вільготнае паветра. На большай частцы тэрыторыі пройдуць снег, мокры снег і дождж. Па паўночным захадзе чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. Сырое і адносна цёплае надвор'е чакаецца ў выхадныя. Ападкаў будзе няшмат, аднак нам абяцаюць туманы і галалёд. Уначы — ад нуля да мінус 5 градусаў, удзень — ад мінус 2 градусаў да 2 цяпла. У нядзелю невялікія ападкі чакаюцца толькі па заходзе краіны. Уначы будзе ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня чакаецца няўстойлівае надвор'е з павышаным тэмпературным рэжымам. У панядзелак уначы ў асобных раёнах, а ўдзень пераважна па паўночна-заходняй частцы краіны кароткачасовы мокры снег. Магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 1—8 марозу, удзень ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла. Па крайнім паўднёвым усходзе ўначы пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Нават удзень чакаецца 6—8 марозу. У аўторак прыйдзе чарговы франтальны раздзел і пацяплее.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Галоўны прынцып — добраахвотнасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адзін пункт загада датычыцца ўзмацнення работы аб'яднанняў па інтарэсах працоўнай скіраванасці — «Умелыя рукі», «Гатуем самі», «Вучымся шыць», «Гаспадынька» і гэтак далей. Адно з прынцыповых новаўвядзенняў — арганізацыя працоўнага выхавання і ўзаемадзеяння школы з сістэмай прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

«Пільная ўвага будзе ўдзелена арганізацыі і правядзенню прафарыентацыйных мерапрыемстваў, дапрафесійнай падрыхтоўцы і прафесійнаму навучанню школьнікаў на базе прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў, — тлумачыцца ў каментарыі. — Правядзенне такіх заняткаў (у шосты школьны дзень) на базе ліцэяў і каледжаў дазволіць школьнікам спасцігнуць навыкі тых ці іншых прафесій».

Педагогаў, натуральна, хвалюе пытанне, як будзе аплачвацца іх праца ў шосты школьны дзень.

«Аплата працы настаўнікаў, якія праводзяць факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з устаноўленай ім педагагічнай нагрузкай. Аплата працы класных кіраўнікоў, якія арганізуюць мерапрыемствы ў шосты школьны дзень, праводзіцца за кошт гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы. Акрамя таго, кіраўнік мае права ўстанаўліваць стымулюючыя выплаты (прэміі, надбаўкі) за правядзенне мерапрыемстваў у шосты школьны дзень», — гаворыцца ў каментарыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by.*

# СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКАМА З МІЛІЦЫЯНЕРАМ ВЫРАТАВАЛІ ЧАЛАВЕКА

**Вёска Галузы Чавускага раёна вымірае, зімой тут амаль ніхто не жыве. Анатоль Кучарэнка таксама прыехаў з Магілёва толькі на пабыўку. Вытапіў печку і ўжо збіраўся сесці снедаць, як адчуў пах дыму. Самастойна ўтаймаваць агонь не атрымалася, толькі сілы дарэмна страціў — не хапіла нават некалькіх крокаў да выратавальнага выхаду.**



Фота Уладзіміра СІНКЕВІЧА.

Аляксандр БАРСУКОЎ: Вось тут была веранда.

— Толькі па шчаслівым збегу абставін гэты чалавек застаўся жывы, — паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС аблвыканкама падрабязнасці гісторыі. — І выратавалі яго старшыня Чавускага райвыканкама Сяргей Драздоўскі і старшы ўчастковы інспектар міліцыі Чавускага РАУС маёр міліцыі Аляксандр Барсукоў. Старшыня якраз наведваў малочнатаварную ферму ў суседняй з Галузамі вёсцы і на адлегласці каля кіламетра ўбачыў слуп дыму. Адразу ж патэлефанаваў у міліцыю і раптавальнікам, а сам паехаў на месца пажару. Хутка да яго далучыўся Аляксандр Барсукоў, які па службе добра ведаў, каму належыць дом і што гэты чалавек часта наведваецца ў бацькоўскую хату.

Як потым расказвалі відавочцы, да іх прыезду дом і гаспадарчыя пабудовы ўжо гарэлі ў поўную моц, з даху ляцелі кавалкі шыферу, вочы выядаў чорны дым. На іх крыкі «ці ёсць хто дома?» ніхто не адгукаўся. І толькі выпадкова ўчастковы заўважыў чалавека, які ляжаў на падлозе веранды. Разам са старшынёй райвыканкама яны выцягнулі яго і перанеслі на бяспечную адлегласць. Якраз падаспелі ратавальнікі і хуткая дапамога.

Ад дома і двух хлявоў, на жаль, засталіся адны вуглі. Як мяркуецца, прычына пажару — парушэнне правіл эксплуатацыі печы, цеплагенерыруючых агрэгатаў і прылад.

Жыццю 51-гадовага мужчыны сёння ўжо нішто не пагражае. Яго ратавальнікі сціпла кажуць, што нічога гераічнага яны не зрабілі. Проста выканалі свой грамадзянскі абавязак. Маўляў, на іх месцы так зрабіў бы кожны.

**Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# ПА ДАХОДНАСЦІ ЛІДЗІРУЮЦЬ РУБЛЁВЫЯ ДЭПАЗІТЫ

**Як толькі ў нас з'яўляюцца лішнія грошы, то адразу ўзнікае пытанне, куды іх укласці, каб яны не згубіліся, а лепш — прынеслі нейкі дадатковы даход. У фінансістаў на конт гэтага прапаноў хапае. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі мяняюцца. Сёння мы прапануем інфармацыю для разваг ад вядомага эксперта на фінансавым рынку кампаніі «ТэлеТрэйд». Спецыялісты кампаніі падрыхтавалі аналіз даходнасці інвестыцыйных інструментаў у нашай краіне за 2016 год.**

## РОСТ КАЦІРОВАК НАФТЫ

На вышыні такога інвестыцыйнага рэйтынгу знаходзіцца нафта, якой у нас здабываецца няшмат. Менавіта яе наша краіна актыўна купляе за мяжой і паспяхова перапрацоўвае. Дык вось. Мінулы год выдаўся вельмі ўдалым для таварна-сыравіннага рынку. Нягледзячы на цяжкія першыя месяцы, нафта ў цэлым за год здолела вырасці больш чым на 50%. Галоўным драйверам росту цэн на нафту сталі цяжкасці ў сланцавай галіне ЗША і дамоўленасці АПЕК і іншых нафтаздабываючых краін аб скарачэнні ўзроўню здабычы нафты.




## НА ВАЛЮЦЕ ПЛЮС МІНІМАЛЬНЫ

Аўтары падрыхтаванага аналізу адзначаюць, што інструменты, якія паказалі найбольшую прыбытковасць у мінулым годзе, адрозніваюцца павышаным узроўнем рызыкі: штомесячная дынаміка іх даходнасці паказвае, што прыбытковыя месяцы чаргаваліся са стратнымі. А вось даход быў мінімальны. Тут летась перад намі быў выбар, які паказаў, што больш «наварыўся» той, хто паверыў у нацыянальную валюту.




Разам з тым, калі перад чалавекам (патэнцыйным інвестарам) стаяла задача захаваць і прымножыць сродкі ў доларавым эквіваленце, то самым кансерватыўным інструментам з'яўляецца дэпазіт у доларах. Мінулы год паказаў, што рызыкі тут практычна цалкам адсутнічаюць, а даход будзе рэгулярным і стабільным, але пры гэтым невялікім. Рублёвыя ўклады, дзякуючы таму што паслабленне рубля да долара па выніках года не перавысіла 5,5%, прынеслі летась куды больш значны прыбытак. Рэальная даходнасць рублёвых дэпазітаў (плюс 15,93%) была амаль у 5 разоў вышэйшая, чым па валютных укладах (3,2%).

## ЗОЛАТА ЦЯПЕР НЕ Ў ТРЭНДЗЕ

У першай палове года добры прыбытак магло прынесці золата. Летась са студзеня па жнівень высакародны метал падаражэў на 30%, але пазней з-за ўмацавання пазіцый долара страціў амаль увесь свой рост. Зліткі прынеслі адмоўны вынік за кошт вельмі высокай розніцы паміж цаной пакупкі і продажу металу (спрэда), а вось абязлічаныя металічныя рахункі маглі быць вельмі выгадным інструментам, асабліва ў сярэднетэрміновай перспектыве. Аднак штомесячнае адкрыццё-закрыццё такога рахунку аўтаматычна «адкусвае» некалькі працэнтаў патэнцыйнага прыбытку за кошт спрэда.

## НЕРУХОМАСЦЬ ПАКУЛЬ МІНУСУЕ

Падзенне цэн на жыллё ў Беларусі ў 2016 годзе прывяло да таго, што інвестыцыі ў нерухомасць былі стратнымі нават без уліку выдаткаў на абслугоўванне здзелак. Мяркуючы па ўсім, рынак камерцыйнай нерухомасці яшчэ не намацаў канчатковае дно, і тэндэнцыя на зніжэнне цэн можа захоўвацца яшчэ некаторы час. Пераламаць яго можа рост даходаў насельніцтва, з'яўленне даступных крэдытаў на жыллё ці нарастанне дэфіцыту прапановы жылля ў сувязі з пэўнымі праблемамі фінансавання ў будаўнічай галіне.




## ФОНДАВАЯ БУРБАЛКА?

Даволі паспяхова ішлі справы на сусветным фондавым рынку: шэраг фондавых індэксаў ў 2016 годзе абнавіў гістарычныя максімумы. Індэкс S & P500 за год прынёс звыш 10% прыбытку. Эксперты не выключаюць, што ўжо сёлета тэндэнцыі зменяцца, бо ёсць прыкметы таго, што на асобных сегментах фондавага рынку з'яўляецца біржавая бурбалка.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*



# СЁННЯ — БЕСПРАЦОЎНЫ, ЗАЎТРА — ПРАДПРЫМАЛЬНІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Бар'еры па ўваходжанні ў бізнес ніжэйшыя, прасцей вывучыць свайго спажыўца — усе як на далоні. Эксперты сыходзяцца на тым, што становішча ў адкрыцці ўласнай справы ў невялікім горадзе больш, чым адмоўнага. Мы вырашылі праверыць гэту тэорыю на практыцы, наведаўшы горад Нароўлю, што ў Гомельскай вобласці. Тут каля 8,5 тысячы жыхароў.

## У БОЛЬШАСЦІ — СФЕРА ПАСЛУГ

Усяго ў Нараўлянскім раёне, па звестках за мінулы год, зарэгістравана 79 прадпрымальнікаў, новых з іх — 13, і амаль абсалютная большасць — гэта ўладальнікі гандлёвых крам. «У асноўным адкрываюцца ІП, якія займаюцца продажам тавараў, некалькі чалавек здзяйсняюць грузаперавозкі ў межах краіны, — расказвае **начальнік аддзела эканомікі Нараўлянскага райвыканкама Алена ЕФІМОВІЧ.** — Ці адкрываюць крамы ва ўласных памяшканнях, ці гандлююць на рынку, ці бяруць памяшканні ў арэнду».

Тых, хто не мае працы, стаіць на ўліку ў службе занятасці і збіраецца адкрыць уласную справу альбо распачаць рамесніцкую дзейнасць, гатова падтрымаць дзяржава. Яны могуць атрымаць субсідыю ў памеры 11-кратнай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму. «У снежні-студзені гэта лічба склала больш за 1919 рублёў», — кажа Алена Ефімовіч. А гэта без малога тысяча долараў. Субсідыю часцей за ўсё выкарыстоўваюць на набыццё абсталявання, інструментаў, матэрыялаў, некаторыя купляюць касавыя апараты.

Сярод тых ІП, што зарэгістраваліся летась, тры прадпрымальнікі і адзін рамеснік, які займаецца апрацоўкай дрэва. Так, на працягу 2016 года розвічныя продаж разгарнуў гандляр адзеннем, абуткам і тэкстылем у палатках і кіёсках, які зарэгістраваны ў Нароўлі, але працуе ў Мазыры. Таксама з'явілася крама «Клякса», дзе гандлююць канцылярскімі таварамі.

## КЛІЕНТЫ АДШУКВАЮЦЦА ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Адна з зарэгістраваных — **Ларыса ЦАЛКА, якая ў верасні мінулага года адчыніла дзверы ўласнай цырульні.** Да таго моманту яна была беспрацоўнай. «Па маладосці вучылася цырульніцкаму майстэрству ва Украіне, працавала там, але мая асноўная спецыялізацыя — арганізацыя і кіраванне кааператыўным гандлем. Цяпер выйшла на пенсію. У прынцыпе цырульню можна лічыць бізнесам сына, а я як маці вырашыла дапамагчы стварыць яму пачатковы капітал», — расказвае Ларыса Аляксандраўна.

Зразумела, што для таго, каб распачаць уласную справу, трэба прыкласці пэўныя намаганні. І не маленькія. Ларыса Цалка згадвае, колькі дакументаў трэба было сабраць, і называе гэта «папяровым пеклам». «Але мясцовыя ўлады паставіліся вельмі добразычліва, аблегчылі, як маглі, усе працэдуры, — расказвае яна. — Дапамагалі ў планавым аддзеле райвыканкама, і тутэйшы архітэктар, і ў службе занятасці, і ў санстанцыі, і ў падатковай службе». Пры гэтым галоўная складанасць заключалася ў тым, што памяшканне ў 18 квадратных метраў для будучай цырульні прадпрымальнікі ўзвялі на прысядзібным участку. Аказалася, што такое для раёна — ледзь не адзінкавы выпадак, і таму спатрэбілася шмат часу для афармлення дадатковай дакументацыі.

Па словах Ларысы Цалка, зараз у Цэнтры стандартызацыі і метралогіі трэба атрымаць адпаведны сертыфікат для аказання паслуг, прайсці атэстацыю. Акрамя таго, яна наведвала курсы для прадпрымальнікаў ад службы занятасці, дзякуючы якім склала бізнес-план. А на атрыманую субсідыю закупілі сушуары і бойлер. Бо калі не інструменты сродкі яшчэ адшукаліся, то на ўсё астатняе не хапала. «Дзяржава вельмі дапамагла — амаль 18 мільёнаў (недэнамінаваных рублёў — **Аўт.**), гэта немаленькая сума для пачатку», — дзеліцца яна.



**Дзяніс у бізнесе ўсяго некалькі гадоў, але ўжо выйшаў на прыбытак.**

Сын Ларысы актыўна карыстаецца інтэрнэтам, таму пра салон, дзе яна адна абслугоўвае кліентаў, ведаюць ужо і ў Мазырскім раёне, людзі часта прыязджаюць з вакольных вёсак. Пад Новы год іх было сапраўды шмат, зараз — значна менш, 1—3 чалавекі ў дзень. «Нядаўна, высветлілася, што ў тутэйшых цырульнікаў няма дзіцячага крэселка. Мы вырашылі набыць. Да нас нават з Гомеля прывезлі малога на стрыжку з гэтай нагоды», — расказвае Ларыса.

## «ГАЛОЎНАЕ, КАБ ГАЛАВА НА ПЛЯЧАХ БЫЛА»

**Дзяніса ПЯТРОЎСКАГА** ў Нароўлі добра ведаюць. У мінулым ён — настаўнік біялогіі і хіміі, дырэктар школы. Сам школу скончыў з залатым медалём, атрымліваў стыпендыю для адоранай моладзі са спецыяльнага фонду Прэзідэнта. Але калі стварыў сям'ю, грошай стала не хапаць. Так з'явілася жаданне працаваць на сябе. «Пачынаў у 2014 годзе цалкам з нуля. Была фінансавая падтрымка з боку фонду сацыяльнай абароны, бралі крэдыт на падтрымку малога бізнесу. На той момант на субсідыі выдзелілі амаль 1000 долараў. Гэтага хапіла, каб спачатку на рынку адкрыць невялікі ларок. За два гады разгарнуўся і адкрыў краму», — расказвае прадпрымальнік.

Спачатку Дзяніс планаваў прадаваць адзенне. Пасля ўзважыў усе «за» і «супраць», прааналізаваў рынак і зразумеў, што будаўнічыя матэрыялы — найбольш перспектыўны кірунак. Бо, па вялікім рахунку, з канкурэнтаў толькі нараўлянскі універмаг. Звязаўся з пастаўшчыкамі, ацаніў цэнавыя пакажчыкі. «Акупіць усе выдаткі пакуль не ўдалося. Прыбытак ёсць, без яго я не развіўся бы з ларка ў краму. Горад маленькі, па-першае, нацэнка вялікай апрыёры быць не можа. 30% — гэта максімальная, але па кожным тавары яе вызначаю сам. Бо больш выгадна прадаць дзесяць рэчаў па нізкай цане, чым адну па высокай, інакш колам сядзіш», — расказвае нараўлянскі бізнесмен.

«Ва універмагу вялікі асартымент, але пад замову там не возяць. Мы ж, калі ёсць магчымасць, можам прывезці тавар на працягу дня», — расказвае маці Дзяніса Ірына Уладзіміраўна.

Падчас нашай гутаркі ў краму пастаянна заходзяць пакупнікі. Муж і жонка вырашылі набыць змяшальнік. Раяцца з Дзянісам. Ён не прапаноўвае ім самы дарагі, дапедаўшыся, што ў тых сям'я вялікая, а падае сярэдні па кошце і неблагі па якасці. Па словах маці Дзяніса, ёсць сем'і, якія ледзь зводзяць канцы з канцамі. Тым яны, калі, напрыклад, шпалеры застаюцца ці плінтусы, аддаюць іх бясплатна. «А як інакш? Мы ж усе людзі. З любым можа здарыцца. Ды і нельга жыць дзеля адных грошай», — кажа Ірына Уладзіміраўна.

Для стварэння бізнесу асаблівых перашкод няма, лічыць Дзяніс, «была б галава на плячах». І ў крызіс, калі ў пакупнікоў грошай становіцца менш, можна «выкруціцца». Напрыклад, ІП супрацоўнічае з «Беларусбанкам». Нядаўна падпісалі дагавор, і цяпер кліенты могуць афармляць беспрацэнтную растэрміноўку на год. З адмоўных момантаў Дзяніс называе тое, што часта з праверкамі прыходзяць розныя службы — ад падатковай інспекцыі да экалагічнага нагляду. Але цяпер ставяцца з большым разуменнем, чым раней, радзей выпісваюць штрафы і часцей папярэджваюць аб памылках.

У перспектыве Дзяніс плануе пашыраць асартымент і адначасова будуе прыдарожнае кафэ, якое плануе зрабіць сямейным, дзе можна было б без алкаголю культурна адпачыць.

## «ШУКАЕЦЕ САКРЭТ ПОСПЕХУ? ЁН У ХАРАКТАРЫ ЧАЛАВЕКА»

Летась **Наталля МАРОЗАВА** разам з мужам адкрыла ўжо другую краму, дзе цяпер прадаюца мыйныя сродкі. Першая — прадуктовая. Калісьці яна працавала ў раённым спажывецкім таварыстве, пасля на прыватніка — у краме харчовых прадуктаў прадаўцом. Пасля з мужам вырашыла адкрыць уласную справу. Спыніліся на магазіне, бо гэтая сфера была бліжэйшай. «З чаго пачыналі? Тады, у 2005 годзе, зарэгістраваліся, атрымалі субсідыю, у чым дапамаглі райвыканкам і служба занятасці. Пачалі заключаць дагаворы з пастаўшчыкамі. Перш за ўсё — гарбата, бакалея... Арандавалі на рынку памяшканне, там гандлявалі. Потым назапасілі капітал, узялі крэдыт і пачалі ўзвядзенне ўласнага будынка, бо на арэндзе было цяжкавата атрымаць прыбытак», — расказвае Наталля.

Асноўная праблема для харчовай крамы — адшукаць баланс у патрабаваннях да прадукцыі з боку вышэйстаячых інстанцый (напрыклад, 80% прадукцыі павінна быць беларускай) і запытам пакупнікоў. «Нам працэй вывучыць попыт. Горад маленькі, ведаем, які пакупнік які ёгурт будзе набываць, якую кілбасу. Маша прыйдзе, напрыклад, па «Біфітат» Мазырскі, тады стараемся, каб менавіта ён быў у наяўнасці. Ці цёця Галя прыйдзе менавіта па кілбасу «Сударушка», бо штодзень бярэ палку ці дзве. Нароўля — вялікая вёска. Заўтра да нас людзі не па ананасы прыйдуць, а па прадукты, якія ўжываюць штодзень. З іншага боку, асноўная прадукцыя — кілбасная, малочная, хлебабулачная — беларуская. Можа, толькі печыва расійскае», — расказвае прадпрымальніца.

Яшчэ адзін важны складнік — гэта калектыў. У краме ён не мяняецца ад стварэння. Бо дырэктар, вядома, важна які, але калі прадаўцы будуць пасіўна ставіцца да справы, то пакупнік не прыйдзе. Па словах Наталлі Марозавай, ніякай нястачы не бывае, ды і калектыў не распадаецца. Бо людзі зараз трымаюцца за работу. Хоць цэлы дзень выстаяць за прылаўкам — не кожны здолее.

«Не думайце, што ўсё так лёгка даецца. Я ў сваім узросце хацела б лепш выглядаць, — прызнаецца прадпрымальніца. — Было б цудоўна, каб дзеці — дочкі — працягнулі справу, бо вельмі шмат укладзена намаганняў і сродкаў. Шукаеце сакрэт поспеху? Яго няма. Усё, як бы банальна ні прагучала, да чалавека залежыць. Калі ён слабахарактарны, не можа адстаяць сваё, то ўласную справу лёгка згубіць. Каб выстаяць, трэба адстойваць уласныя інтарэсы. Галоўнае — не зламацца і бачыць у тым, што робіш, перспектыву».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

*г. Нароўля*

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
3
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# КАЛЯДЫ: ЗНАЁМЫЯ НЕЗНАЁМЦЫ

## АГУЛЬНАБЕЛАРУСКАЕ СВЯТА МАЕ ШМАТ РЭГІЯНАЛЬНЫХ АДМЕТНАСЦЯЎ

**Снежань і студзень у народным календары беларусаў зазвычай праходзілі пад знакам Калядаў. Гэтага свята чакалі, да яго рыхтаваліся, таму і спраўлялі заўсёды шумна і весела, усёй вясковай грамадой. Вось і каманда праекта «Наперад у мінулае» з радасцю адсвяткавала Каляды, а цягам амаль двух месяцаў распавядала гледачам тэлеканала «Беларусь 3» пра іх адметнасці ў розных мясцінах Беларусі. І ўжо ў нядзелю, 29 студзеня, у эфір выйдзе выніковы міні-мюзікл. Карэспандэнт «Звязды» праграму ўжо пабачыў, таму з задавальненнем дзеліцца ўражаннямі з чытачамі.**

### «НАМ ПІЛІПАЎКА НАДАКУЧЫЛА»

Традыцыйна завяршэнне года ў народзе лічылася ці не самым цяжкім перыядам. Ночы доўгія і халодныя, час цягнецца павольна, ды яшчэ і пост, што пачынаецца ў канцы лістапада і доўжыцца да Калядаў, забараняе танцаваць, спяваць і весяліцца. Гэтымі днямі многія хварэлі, адбываліся страшныя падзеі. Памятаеце Купалаву раннюю паэму «У Піліпаўку» з трагічным сюжэтам, напоўненую жахамі і містыкай? Таму ў многіх мясцовасцях Беларусі, каб падрыхтавацца да посту, прынята было спраўляць Запускі — апошнія вячоркі перад пачаткам Піліпаўкі, калі можна ўволю павесяліцца і паспяваць перад месяцам вымушанай нуды. Менавіта на Запускі нас запрашае гурт «Смаляначка» вёскі Кабылаўка Кобрынскага раёна.

А вось святкаваць самі Каляды пачнём у вёсцы Акцябр Кобрынскага раёна, дзе спачатку калядуюць без традыцыйнай галоўнай гераіні — сімвалу ўрадлівасці Казы. Тут Каза з'яўляецца ў гурце калядоўшчыкаў крыху пазней — на Шчодрык. У гэтай вёсцы ўдалося запісаць і адметную калядную песню з вось такімі словамі:

*Добры вечар табе, пане гаспадару!*
*Радуйся зямля, сын Божы нарадзіўся.*
*Засцілайце сталы, ды ўсе пелянамі,*
*Кладзіце калачы з яравой пшаніцы.*

Цікава, што хоць у святкаванні Калядаў па ўсёй краіне прысутнічаюць агульныя рысы, свята мае і рэгіянальныя адметнасці, пэўныя элементы, характэрныя для адной вёскі ці раёна. Так, у вёсцы Аранчыцы Пружанскага раёна не толькі гаспадары вітаюць і частуюць калядоўшчыкаў, але і калядоўшчыкі — гаспадароў. Гурт «Бабіна лета» ў межах праграмы тлумачыць: перад калядаваннем пякуцца піражкі, якія гурт калядоўшчыкаў носіць з хаты ў хату ў рэшаце. Лічыцца, што ніводная хата не павінна застацца без такога пачастунку, а напрыканцы абыходу хат — піражкоў у рэшаце. У песнях тут прынята Каляды клікаць:

*Ой, Калядданькі, дай хадзіце к нам,*
*Хадзіце к нам, бо мы рады вам.*
*Нам Піліпаўка надакучыла,*
*Бо кудзелькамі нас замучыла.*

### «ЦЯРЭШКА, ШАХУ-ШАХУ, ШТО Ў ЦЯБЕ Ў МЯХУ?»

Галоўнай гераіняй «класічнага» калядавання часта выступала Каза, якая ва ўсіх хатах танцавала, падала і ўставала — «нараджалася» зноў. Нездарма ж паўсюль кажуць: «Дзе Каза ходзіць — там жыта родзіць. Дзе Каза не бывае — там усё прападае». А вось у вёсцы Восава, што на Салігоршчыне, Казой у гурце быў не пераапрануты ў вывернуты кажух чалавек. Тут з хаты ў хату носяць пудзіла казы, а галоўнай дзеючай асобай выступае Дзед у берасцяной масцы. Гэтая маска, магчыма, адзіная ў Еўропе захавалася ў жывым бытаванні.

На Віцебшчыне, менавіта на Шуміліншчыне і Гарадоччыне, Каляду вітаюць адметнай песняй:

*Прыехала Каляда ў вазочку*
*Ды на сівенькім канёчку.*
*Каляда-Каляда-Калядзіца,*
*Ты добрая маладзіца.*
*Прыехала Каляда ўвечары,*
*Прывязала пірагоў, печыва.*
*Прыехала Каляда ўвечары,*
*Прывязла яна дудак рэшата.*
*Паставіла дудкі на стале,*
*А сама села на куце.*
*Іграйце дудкі тоненька,*
*Скачыце, дзяўчаткі, хорашанька.*
*А вы, хлопчыкі, пазірайце*
*Ды дзяўчыначак выбірайце.*

Цікава, што калядныя абрады і гульні захоўваюцца ў сваім традыцыйным варыянце і жывуць у вясковым асяродку. Так, на Лепельшчыне і сёння любімай забавай моладзі ў калядныя святы застаецца гульня «Жаніцьба Цярэшкі», унесеная ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Натуральна, што ў праграме пра Каляды нельга было абмінуць увагай Цярэшку. Галоўны персанаж Цярэшка мае міфічнае паходжанне. Ён сустракаецца ў народнай казцы і з'яўляецца «драўляным хлопчыкам», што ажывае на радасць бяздзетным бацькам, а з цягам часу ў народнай свядомасці ператвараецца ў апекуна, дарадчыка.

Сама па сабе гульня «Жаніцьба Цярэшкі» вельмі цікавая. Па сутнасці гэта вясельна-тэатральная дзея, што спалучае тэатр, спевы, танцы, музыку, імправізацыю. З боку старэйшых выбіраюць «бацьку» і «маці», якія сочаць за парадкам правядзення абраду, рытуальна-абрадавым частаваннем і агульнай весялосцю.

Бацька спявае такую песню:

*Я дзядок яшчэ нічога,*
*Пасадзіў пшанічкі многа,*
*А пшанічка ўся калосіцца,*
*За мной дзеўкі ўсе носяцца.*

Глыбінная сутнасць абрадавай гульні заключаецца ў магчымасці для моладзі пазнаёміцца, знайсці сабе пару. Цікава, што ў «Цярэшцы» няма гледачоў і выканаўцаў, усе з'яўляюцца яе ўдзельнікамі. І як паказвае практыка, даволі часта пары, што ўтварыліся для жартоўнага вяселля, потым ствараюць сапраўдныя сем'і.

Так, пасля святкавання Калядаў сонца «паварочваецца на лета», дзень становіцца даўжэйшым, а мы пачынаем чакаць вясны. Таму ўжо ў лютым разам з праектам «Наперад у мінулае» мы распачнём Масленічны тыдзень і будзем рыхтавацца гукаць вясну.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*



**Калядуе гурт «Гульбічы» Шумілінскага раёна.**

■ Ёсць нагода

# ЦЫРК, ДЫ НЕ ТОЛЬКІ

## 10 гадоў таму на тэлеэкраны выйшла першае беларускае рэаліці-шоу

**У студзені 2007 года тэлеканал АНТ прадставіў сваім гледачам гучную прэм'еру — рэаліці-шоу «Зорны цырк», у якім людзі рознага ўзросту і прафесіі асвойвалі майстэрства цыркавых артыстаў. Ліцэнзійнае шоу стала не толькі першым падобным вопытам для айчыннага тэлебачання, але і першым праектам, які беларусы рэалізавалі раней за суседзяў-расіян.**



Фота БЕЛТА.

**Сакавік 2007 года. Пераможца рэаліці-шоу «Зорны цырк» Павел КЕЖА.**

Нагадаем, у лік 12 удзельнікаў, для якіх на 100 дзён цырк стаў і асноўным месцам працы, і другім домам, увайшлі не толькі папулярныя артысты і тэлевядучыя, але і зусім непублічныя людзі — хатняя гаспадыня, банкір, індывідуальны прадпрымальнік, менеджар і нават настаўнік беларускай мовы і літаратуры. Уласна, апошні — віцяблянін Павел Кежа — і стаў пераможцам тэлепраекта, уладальнікам галоўнага прыза — аўтамабіля.

**Ва ўсіх тэлепраектах, незалежна ад іх кірунку, улічваецца менталітэт беларусаў і таму ніколі не запусцім у эфір праграм з жорсткімі іспытамі, здзекамі і зняважэннем удзельнікаў**

...Калі большасць медыйных удзельнікаў першага беларускага рэаліці-шоу і сёння, што называецца, «у абойме», то пра іншых мала што вядома — хіба толькі Павел Кежа расказаў гадоў пяць таму айчынным СМІ, што з фінансавых меркаванняў вымушаны быў змяніць школу на сферу гандлю...

— Ці плануеце вы нейкім чынам адзначыць 10-годдзе «Зорнага цырка» — можа, зладзіць «вечар сустрэчы выпускнікоў» і расказаць гледачам, як скаладся лёсы ўдзельнікаў? — пацікавілася «Звязда» ў **дырэктара дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжаліны МІКУЛЬСКАЙ.**

— Жыць мінулым, напэўна, не зусім правільна, таму мы вырашылі не вяртацца да гэтага праекта, хоць яго і ўспамінаем з вялікай цеплынёй. За лёсамі многіх удзельнікаў «Зорнага цырку» мы так ці інакш сочым, тым больш некаторыя з іх — Люцыя Герашчанка, Наталля Радзіна — працуюць на АНТ; а вось наконт «сустрэчы выпускнікоў» ідэя цікавая, трэба падумаць. Прыадкрыю сакрэт, што тэма цырка будзе выкарыстана намі яшчэ раз, літаральна гэтым летам, у новым праекце — але падрабязнасцяў заўчасна, самі разумееце, раскрываць не будзем. Магу толькі запэўніць гледачоў, што ва ўсіх тэлепраектах, незалежна ад іх кірунку, улічваецца менталітэт беларусаў і таму ніколі не запусцім у эфір праграм з жорсткімі іспытамі, здзекамі і зневажаннем удзельнікаў, якімі б рэйтынгавымі гэтыя ідэі не былі.

### МІЖ ІНШЫМ

**Усяго за мінулыя гады АНТ выпусціла ў эфір больш за дзясятак рэаліці-шоу і практычна столькі ж — музычных і забаўляльных тэлепраектаў. Самым вялікім прызам стала кватэра, якую атрымала пераможца конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2008» Вольга Хіжынкова.**

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## Аўторак, 31 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х.
**9.10** Спецыяльны рэпартаж.
**9.25, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Ліст чакання».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40 Спецыяльны рэпартаж.**
**0.20** Дзень спорту.
**0.35 Серыял «Паляўнічыя на брыльянты».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.35** Тэлебарометр.
**9.05, 18.40 Серыял «Кухня».**
**10.15, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.05, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.00, 22.40 Серыял «Шурачка».**
**12.30, 19.45** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.15, 21.25, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 0.05** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.10** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.10** «Як гартаваўся стайл-2». Сіткам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Грыбны суп.
**8.05, 12.25, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Фурцава». Драма.**
**9.05 «Тры жанчыны. 1943: сустрэча». Драма.**
**11.05** «Гітара па крузе».
**11.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Барыса Сцяпанава.
**12.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.10** «Музеі Беларусі». Музей Першай сусветнай вайны ў в. Заброддзе.
**13.35** «Полымя і попел Першай сусветнай. Крэпасць Асавец. Руская не здаюцца». Дак. фільм.
**14.00, 23.55** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**14.25 «Свята Нептуна». Камедыя.**
**15.10** «Подых струн».
**15.50** «Сталінградская бітва». «Пачатак».
**16.30, 21.45 «Руіны страляюць». Драма. 1—2-я серыі.**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Выйсце ёсць». Аляксандр Яфрэмаў.
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «Сталінградская бітва». «Вайна ў горадзе».

### Беларусь 5

**8.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** «Два бакі алімпійскага медаля». Вадзім Стральцоў.
**9.10** Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» (Хельсінкі) — «Дынама-Мінск».
**11.00, 21.45** Тэніс. Турнір WTA. Санкт-Пецярбург.
**17.00** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Спрынт. Мужчыны.
**18.25** Авертайм.
**18.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — PRO спорт. Навіны).
**21.15** Спорт-кадр.
**23.50** PRO спорт. Навіны.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.30** «Бесталковыя нататкі».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Грачанка».**
**22.40 Серыял «Усё спачатку».**
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.35, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.20 «Next-3». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** Драма «Сумненне».
**15.40** «Ведай нашых!»
**16.00 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.55 «Участак лейтэнанта Качуры». Серыял.**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Маша ў законе-2».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».
**15.15** Шоу «Няма праблем!»
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**19.20 Серыял «Закон і парадак-3».**
**22.10 Маст. фільм «Каханы па найме».**
**0.05 Маст. фільм «Шахеншах».**
**3.05 Серыял «Жаданая».**
**5.45 Серыял «Закон і парадак».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Вы заказвалі забойства».**
**21.40** «Пакой смеху».
**22.00, 23.10 Серыял «Доктар Ганна».**
**0.05** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Адвакат».**
**7.00** «Дзелавая раніца НТБ».
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Браценікі».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Тайны следства».
**14.25 Серыял «Шэрыф».**
**16.40 Серыял «Апошні мент».**
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Чума».**
**21.25 Серыял «Адзін супраць усіх».**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Вандраванні Сіндбада».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Камедыя «За бортам».**
**13.00 Серыял «Імперыя».**
**14.00 Трылер «Дарога лютасці».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** Мультпарад.
**17.40 Серыял «Людзі ў дрэвах».**
**18.30 Серыял «Падмані мяне».**
**19.20 Серыял «Здрада».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Камедыя «Па-банку. Удар у адказ».**
**23.10 Серыял «Барыгі».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Ёка».
**7.20** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**7.35** М/ф «Маша і мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Драма «За мной апошні танец 2».
**11.20** Скетчкам «Студэнты».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 20.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».
**15.00, 2.00** Серыял «Дзетка».
**16.00** Серыял «Мамачкі».
**17.00, 23.00** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Камедыя «Нянькі».
**23.30** Серыял «Месяц».
**0.30** «Не можа быць!»
**1.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**3.00** Серыял «Нанакахание».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.35** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.40, 20.45** Сусветныя скарбы.
**13.00, 21.00** «Правілы жыцця».
**13.30** «Пятае вымярэнне».
**13.55** «Алена Блаватская». Дак. фільм.
**14.05, 23.40** «Шалёныя мадэрністы». Дак. серыял.
**15.10, 21.30** «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял.
**16.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.50** «Глеб Кацельнікаў. Стропы жыцця». Дак. фільм.
**17.35** Майстар-класы. Прафесар каралеўскіх акадэмій Лондана, Мадрыда і Ратэрдама Захар Брон.
**18.35** «Вясёлы жанр невясёлага часу». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Эскіз Сусвету Пятрова-Водкіна». Дак. фільм.
**22.30** «Гульня ў бісер». «Гі дэ Мапасан. «Пампушка».
**23.10** «Ульям Гершэль». Дак. фільм.
**23.35** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Вячаслаў Бутусаў. 1994 год.
**6.40, 7.50, 11.35, 12.55, 14.25, 15.40, 17.00, 17.40, 19.00, 20.30, 21.40, 23.00, 0.55** Музычная настальгія.
**7.10** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Па абодва бакі закона». 1992 год.
**8.15** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**9.00** Маст. фільм «Кахаць чалавека».
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
**13.20, 19.20** Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
**14.50, 20.50** «Прэс-экспрэс».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Клара Новікава.
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітноўскім: «Фігурнае катанне». 2005 год.
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1964. 2-я частка. 2011 год.
**1.15** «КВЗ-87». НГУ—ДГУ.
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Калі верыць Лапатухіну...»

### EuroSport 1

**3.30, 7.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
**5.00, 9.00, 0.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 17.00** Тэніс. Australian Open.
**10.00, 15.30** Лыжныя гонкі. Універсіяда.
**11.15, 16.15** Біятлон. Універсіяда.
**12.45, 21.00, 1.15** Веласпорт. «Тур Дубая».
**14.30** Зімовыя віды спорту.
**18.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**22.30** Тэніс. Australian Open. Мужчыны. Фінал.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**2.50** Камедыя «Сутэнёр».
**4.25, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**5.15** Камедыя «Госць».
**6.50** Камедыя «Хачу як Брыджэт».
**8.30** Камедыя «Найноўшы запавет».
**10.35** Камедыя «Бос у гасцінай».
**12.25** Камедыя «Шчаслівае сямейства».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Чатыры таксісты і сабака-2».
**18.25** Камедыя «Тата напракат». 2-я серыя.
**19.30** Драма «Гонар».
**21.40** Меладрама «Круты паварот».
**23.40** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40, 14.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.05** «Доктар І...»
**8.35, 19.00, 2.20** «Асколкі». Серыял.
**10.10, 3.40** «Судовыя справы». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**15.25** «Здзелка».
**16.00, 5.10** «Натуральны адбор».
**16.55, 21.25** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.35, 1.35** «Вяселле і развод».
**22.45** «Гісторыі вывратавання».
**23.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.00** «Нясцерпныя босы». Камедыя.

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Драма «Куды прыводзяць мары».
**8.30** Трылер «Версія».
**10.55** Фэнтэзі «Па-за часам».
**13.10** Фэнтэзі «Інтэрв'ю з вампірам».
**15.40** Камедыя «Як займацца любоўю па-англійску».
**20.10** Драма «У чаканні вечнасці».
**21.55** Трылер «Імгла».
**0.10** Драма «Шукальнік вады».
**2.10** Меладрама «Спадарыня пакаёўка».
**4.10** Трылер «Ціхая гавань».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** «Коля — Перакаці-поле».
**8.20** «Няўлоўныя».
**10.20** «Нерэальнае каханне».
**12.10** «Прорва».
**14.15** «Яйцы Лёсу».
**16.00** «Іван».
**18.00** «Паляванне на Піранню».
**20.20** «Няўлоўныя: апошні герой».
**22.00** «Арэлі».
**23.40** «Не хлебам адзіным».
**1.45** «Без мужчын».
**3.10** «Увесь гэты джэм».
**4.50** «Пятніца».

### National Geographic

**6.00, 13.15** Гульні розуму.
**6.20, 21.00, 0.45, 3.50, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 10.55, 14.50** Мегазаводы.
**8.35, 15.35, 22.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.20, 17.55** Антарктыка.
**10.10, 0.00, 3.05** Уварванне на Зямлю.
**11.45, 16.20, 19.30, 23.15, 2.15** Расследаванні авіякатастроф.
**12.30, 18.40, 21.45, 1.35, 4.30** Космас: прастора і час.

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Зроблена з другаснай сыравіны.
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Хуткія і гучныя.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Калекцыянеры аўто.
**19.00** Аўтальянцы.
**20.00** Мотарэстаўрацыя.
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.




# Жур для жмінды

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Мажа́ры** (абласное) — вялікія сялянскія калёсы з высокімі драбінамі.

**Ма́занка** — хата, пабудаваная з гліны, тонкага дрэва, абмазанага глінай.

**Жмі́нда** — вельмі скупы чалавек. *«Мікодым, хоць і быў жмінда, на гэты раз не паскупіўся»,* — чытаем у Рамана Сабаленкі.

**Жур** — негусты аўсяны кісель.

**Абціна́ць** — абсякаць, абразаць канцы чаго-небудзь.

**Кпіць** — насміхацца, здзекавацца.

**Як на падбор** — зусім аднолькавыя і добрыя па якіх-небудзь якасцях. Беларусы яшчэ скажуць: адзін у адзін, як адзін, і хваты і зухі. Рускія: как один, как на подбор.

Працытуем Якуба Коласа:
*Якія ж, хлопцы, вы ды хваты!*
*Як на падбор: адзін ў адзін!..*

**Наламаць дроў** — нарабіць грубых памылак. Беларускі адпаведнік: хапіць цераз край. Рускі: перегнуть палку.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

## Тэлесеткі

# Смачна есці па-студэнцку

**На тэлеканале «Беларусь 2» пачаўся новы сезон міжнароднага студэнцкага кулінарнага праекта «Універ-шэф». На званне лепшага шэф-повара прэтэндуюць навучэнцы чатырох вядучых ВНУ Беларусі: БДУ, МДЛУ, БДАМ і БДУКМ. Але гэтым разам да 16 прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў далучыцца яшчэ адзін квартэт удзельнікаў — зборная студэнтаў, якіх уласныя універсітэты «адлічылі» ў пачатку праекта.**

У спаборніцтве юнакі і дзяўчаты гатуюць не толькі папулярныя, але і нацыянальныя стравы розных краін свету, у тым ліку з экзатычнымі інгрэдыентамі нашталт... змей або мадагаскарскіх прусакоў. Сярод іншых заданняў «Універ-шэфа» — правесці дзень на кухні і за касай сеткі фаст-фуду, паспрабаваць дагадзіць наведвальнікам аднаго з элітных рэстаранаў, задаволіць густы самых прыдзірлівых крытыкаў — дзяцей. Ацаніць кулінарныя творы студэнтаў рызыкнулі беларускія артысты Аляксей Хлястоў, Алена Ланская, Георгій Калдун, Саша Нема, Галіна Шышкова і іншыя, а таксама прафесіяналы свету высокай кухні — шэф-повары Вадзім Турноўскі, Павел Круглік, Марка Якета. Сачыць за перыпетыямі праекта можна кожную нядзелю ў дзённым эфіры «Беларусь 2».

Вікторыя ЗАХАРАВА

## Серада, 1 лютага

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.35 Зона Х.
9.10 Нашы.
9.25, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
13.20 Дзень у вялікім горадзе.
14.20 Дзіцячы доктар.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Серыял «Ліст чакання».
17.40 Беларуская часінка.
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 Актуальнае інтэрв'ю.
0.25 Дзень спорту.
0.35 Серыял «Паляўнічыя на брыльянты».

### Беларусь 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 22.35 Тэлебарометр.
9.05, 18.40 Серыял «Кухня».
10.15, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».
11.05, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.00, 22.40 Серыял «Шурачка».
12.30, 19.45 «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
14.15, 21.30, 22.05 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
15.20 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
16.00, 0.05 «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
18.10 «Пра ежу».
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
23.10 «Як гартаваўся стайл-2». Сіткам.

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.40 «Беларуская кухня». Печаная рыба.
8.05, 11.45, 20.20 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20, 18.40 «Фурцава». Драма.
9.10, 14.15 «Тры жанчыны. Спявачка». Драма.
10.45 «Гітара па крузе».
12.00 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
12.35 «Наперад у мінулае».
13.00, 0.00 «Дыя@блог». Пра прыгожае.
13.25, 19.35 «Доктар Жывага». Драма. 1-я серыя.
15.50 «Сталінградская бітва». «Вайна ў горадзе».
16.25, 21.45 «Руіны страляюць». Драма.
20.40 «Калыханка».
21.05 «Сталінградская бітва». «У наступленне».

### Беларусь 5

8.00, 22.15 PRO спорт. Навіны.
8.10 Спорт-кадр.
8.35 Авертайм.
9.05 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск».
11.00, 20.10 Тэніс. Турнір WTA. Санкт-Пецярбург.
16.55 Хакей. КХЛ. «Аўтамабіліст» (Екацярынбург) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
19.20 Козел пра футбол.
19.40 Слэм-данк.
22.25 Хакей. КХЛ. «Аўтамабіліст» (Екацярынбург) — «Дынама-Мінск».

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05, 8.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.30 «Бесталковыя нататкі».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.10 «Сам-насам з усімі».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10, 16.20 «Час пакажа».
16.55 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Грачанка».
22.40 Серыял «Усё спачатку».
0.25 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
8.30, 23.05 «Тайны Чапман».
9.35, 18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
10.40, 23.55 «Next-3». Серыял.
12.30, 17.35 «Званая вячэра».
13.50 «Тэрыторыя памылак».
15.30 «Следакі». Серыял.
16.50 «Аўтапанарама».
17.10 «Ведай нашых!»
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Сакрэтныя тэрыторыі».
22.00 «Глядзець усім!»

### МІР

6.00 М/ф.
7.30 Добрай раніцы, свет!
9.00, 3.05 Серыял «Жаданая».
12.30 «Цяжар абеду».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 Дак. фільм «Сямейныя драмы».
14.15 Шоу «Няма праблем!»
16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
19.20 Серыял «Закон і парадак-3».
22.10 Маст. фільм «Ванька».
23.55 Дак. фільм «Леў Лешчанка. Ні хвіліны спакою».
1.00 Маст. фільм «Любімы Раджа».
5.10 Серыял «Закон і парадак».

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Пакой смеху».
12.00 «60 хвілін». Ток-шоу.
13.15 «Правілы жыцця».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.40 «Прамы эфір».
17.20 Серыял «Васіліса».
19.10, 20.40 Серыял «Вы заказвалі забойства».
21.40 «Пакой смеху».
22.00, 23.10 Серыял «Доктар Ганна».
0.05 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10 Серыял «Адвакат».
7.00 «Дзелавая раніца НТБ».
8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».
9.40, 23.05 «НЗ.by».
10.25 Серыял «Браценікі».
12.00 Суд прысяжных.
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.00 «Тайны следства».
14.25 Серыял «Шэрыф».
16.40 Серыял «Апошні мент».
17.35 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.45 Серыял «Чума».
21.25 Серыял «Адзін супраць усіх».
23.25 «Вынікі дня».
23.55 Серыял «Вандраванні Сіндбада».

### 8 канал

7.00 Раніца на «Восьмым».
10.30 «Адшукваецца адпачынак».
11.10 Маст. фільм «Раман з каменем».
13.00 Серыял «Імперыя».
14.00 Меладрама «Версальскі раман».
15.45, 19.10, 20.55, 23.55 «Надвор'е».
15.50 Мультпарад.
17.10 Серыял «Людзі ў дрэвах».
17.55 Серыял «Падмані мяне».
18.40 «Мой любімы гадаванец».
19.15 Серыял «Дэн».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Край».
23.05 Серыял «Барыгі».

### ВТБ

6.00 «Турбаміксер».
7.00 М/ф «Тры каты».
7.05 М/ф «Ёка».
7.20 М/ф «Прыгоды Дзіна».
7.35 М/ф «Маша і мядзведзь».
7.45 М/ф «Машыны казкі».
7.50 М/ф «Фіксікі».
8.00 «Ералаш».
8.30, 18.00 Серыял «Варонины».
9.30 Драма «Хаціко: самы верны сябар».
11.20 Скетчкам «Студэнты».
12.00, 5.00 Серыял «Сакратар».
13.00 «Паспець за 24 гадзіны».
14.00, 20.00 Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».
15.00, 2.00 Серыял «Дзетка».
16.00 Серыял «Мамачкі».
17.00, 22.50 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Закрытая школа».
21.00 Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
23.30 Серыял «Месяц».
0.30 «Не можа быць!»
1.30, 4.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
3.00 Серыял «Нанакаханне».
4.30 «Лаві момант».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.20 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Назіральнік».
11.15, 0.35 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
12.45, 20.45 Сусветныя скарбы.
13.00, 21.00 «Правілы жыцця».
13.30 «Пешшу...» Крым сярэбраны.
13.55 «Томас Кук». Дак. фільм.
14.05, 23.40 «Шалёныя мадэрністы». Дак. серыял.
15.10, 21.30 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял.
16.05 Штучны адбор.
16.50 «Больш чым каханне». Валерый Чкалаў і Вольга Эрэхава.
17.35 Майстар-класы. Прафесар Каралеўскага каледжа музыкі ў Лондане Дзмітрый Аляксееў.
18.25 «Шарль Кулон». Дак. фільм.
18.35 «Вясёлы жанр невясёлага часу». Дак. серыял.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.05 «Абсалютны слых».
22.30 Улада факта. «Вытокі рускага кансерватызму».
23.10 «Васка да Гама». Дак. фільм.
23.35 Мастсавет.

### Настальгія

6.10 The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
7.05, 8.25, 9.40, 11.00, 11.35, 12.55, 14.25, 15.40, 17.00, 17.40, 19.00, 20.30, 21.40, 23.45, 0.40, 1,50, 5.35 Музычная настальгія.
7.20, 13.20, 19.20 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
8.50, 14.50, 20.50 «Прэс-экспрэс».
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час».
10.00, 16.00, 22.00 «Нараджаныя ў СССР».
11.20 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Клара Новікава.
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Фігурнае катанне». 2005 год.
13.20 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга». 2-я серыя.
18.00 «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2007 год.
23.05 «Я сама». Тэма: «Мяне не змяніла ўлада». Эла Памфілава. 1995 год.
0.00 «Акулы пяра». Вячаслаў Бутусаў. 1994 год.
1.10 Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Па абодва бакі закона». 1992 год.
2.15 «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
3.00 Маст. фільм «Кахаць чалавека».

### EuroSport 1

2.00, 8.00, 11.30 Біятлон. Універсіяда.
2.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
3.30, 7.00, 10.45, 15.15 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
5.00 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
10.00, 19.30 Лыжныя гонкі. Універсіяда.
12.30, 18.30, 1.00 Веласпорт. «Тур Дубая».
14.30, 16.30, 20.00, 2.30 Скачкі з трампліна. Універсіяда.
17.30, 1.45 Веласпорт. «Тур Валенсіі».
21.00 Лёгкая атлетыка. Спаборніцтвы ў памяшканні.
23.00 Снукер. German Masters.

### Кінакамедыя

01.35 Камедыя «Усё магу».
03.10 Прыгоды «Фантамас».
05.05 Меладрама «Чаго хочуць жанчыны?»
7.20 Камедыя «Бамбу».
9.05 Камедыя «Шалёныя настаўнікі».
10.45 Камедыя «Два ў адным».
12.20 Камедыя «Мамулі».
14.00, 14.50, 15.40 Скетчкам «Паміж намі».
14.20, 15.10 «Камедыянты (Шоу)».
16.25 Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
18.35 Камедыя «Тата напракат». 3-я серыя.
19.35 Драма «Найлепшы тата».
21.20 Камедыя «Багіня».
23.15 Камедыя «Найноўшы запавет».

### ТБ3

6.00 М/ф.
8.00, 14.50 «Ёсць адзін сакрэт».
8.25 «Доктар І...»
8.55, 19.00, 3.05 «Асколкі». Серыял.
10.15, 4.30 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
11.55 «Сляпая».
12.50 «Варажбітка».
13.50 «Паралельны свет».
15.20 «Здзелка».
15.50 «Натуральны адбор».
16.45, 21.40 «Рэвізора».
18.00 «Тайны следства». Серыял.
20.40, 2.10 «Магазіна».
22.40 «Лінія абароны».
23.10 «Звышнатуральнае». Серыял.
23.55 «Расамаха: бессмяротны». Фантастыка.

### ТБ1000

6.10, 17.50 Трылер «Нічога асабістага».
8.35 Трылер «Імгла».
11.10 Драма «Шукальнік вады».
13.25 Меладрама «Спадарыня пакаёўка».
15.30 Трылер «Ціхая гавань».
20.10 Камедыя «Правілы здыму: метад Хітча».
22.25 Драма «Параноя».
0.20 Трылер «Яна яго кахае».
2.15 Фэнтэзі «Як злавіць монстра».
3.55 Драма «Успаміны пра будучыню».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 «Арэлі».
8.10 «Няўлоўныя: апошні герой».
9.50 «Не хлебам адзіным».
12.05 «Акадэмія пана Кляксы». 1-я серыя.
13.40 «На залатым ганку сядзелі».
14.55 «Увесь гэты джэм».
16.35 «Пятніца».
18.10 «Радзіма».
20.20 «Фарт».
22.20 «Гарпастум».
0.40 «Вайна полаў».
2.30 «На кручку!»
4.20 «Іерэй-сан. Споведзь самурая».

### National Geographic

6.00, 13.20 Гульні розуму.
6.45, 9.30, 17.55, 5.10 Навуковыя недарэчнасці.
7.55, 11.00, 14.50 Мегазаводы.
8.40, 15.40, 22.25 Міжнародны аэрапорт Дубай.
10.15 Уварванне на Зямлю.
11.45, 16.25, 19.25, 23.10, 2.10 Расследаванні авіякатастроф.
12.35, 18.45, 21.45, 1.30, 4.30 Космас: прастора і час.
21.00, 0.45, 3.45 Золата Юкана.

### Discovery

8.00, 14.00, 0.00, 3.50 Залатая ліхаманка.
9.00, 15.30 Зроблена з другаснай сыравіны.
9.30, 15.00, 21.00, 5.30 Як гэта зроблена?
10.00, 16.00, 23.00, 7.10 Паляўнічыя на рэліквіі.
10.30, 16.30, 18.00, 23.30, 7.35 Паляўнічыя на склады.
11.00 Маталаломшчыкі.
17.00, 22.00, 2.55 Махінатары.
19.00 Ліквідатар.
20.00 Даліны смерці.
21.30, 5.55 Як гэта ўстроена?
1.00, 6.20 Не спрабуйце паўтарыць.
2.00, 4.40 Маланкавыя катастрофы.

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** У цэлым тыдзень вельмі дынамічны і пераменлівы, у ім будзе нямала удалых момантаў, за якія варта ўхапіцца. Па магчымасці скарацiце аб'ём працы. Залішняя актыўнасць пагражае прывесці да канфліктнай сітуацыі. Перш чым рашуча дзейнічаць, усё добра прадумайце. Пастаўцеся з увагай да нюансаў і дробязяў. Пажадана не паказваць блізкім нецярпімасць да некаторых праблем, інакш усё пойдзе наперакасяк. К суботу да вашых парад будуць прыслухоўвацца. Вольны час лепш прысвяціць сям'і, дзецям або каханаму чалавеку.



**ЦЯЛЕЦ.** Вы напэрадзе даволі гарманічнага перыяду. Тыдзень спрыяльны для прасоўвання па рабоце, адкрыцця новых магчымасцяў для руху наперад. Панядзелак і аўторак варта прысвяціць завяршэнню спраў, якія цягнуцца яшчэ з мінулага тыдня. Цяпер самы час для сур'ёзных разважанняў. Усе сустрэчы тыдня невыпадковыя, яны абяцаюць месц працяг. Многія пытанні ўдасца вырашыць з дапамогай вашай прывабнасці. Пятніцу можаце прысвяціць планаванню сустрэч і падарожжаў на месяц наперад.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні магчыма павышэнне па службе, якога вы так доўга чакалі. А магчыма вы атрымаеце дадатковы прыбытак. Але не варта распавядаць пра гэта старонням. Час добры для прыняцця важных рашэнняў і адказных крокаў, будзеце адчуваць у сабе сілу і ўпэўненасць, але гэта не павінна пераходзіць у самадурства. Скарыстайцеся магчымасцю і разбярыцеся з праблемамі, якія назапасіліся апошнім часам. Паспрабуйце не злоўжываць добрым стаўленнем да вас каханага чалавека.



**РАК.** Вы можаце паспяхова справіцца з самымі складанымі задачамі, якія раней называліся невырашальнымі. У панядзелак і аўторак пастаўцеся з асцярогай да новых дзелавых прапаноў. У сераду пажадана знізіць аб'ём работы, паспрабуйце аб'ектыўна ацэньваць свае магчымасці. Не расказвайце пра сябе занадта шмат на працы, гэтая інфармацыя можа быць выкарыстана супраць вас. А вось ад сяброў пачуццяў можна не хаваць. Яны з разуменнем паставяцца да вас, такая падтрымка падбадзёрыць і надасць сіл.



**ЛЕЎ.** Тыдзень складаны, таму запасіцеся цярпеннем і вытрымкай. Вам трэба будзе праявіць сябе ў поўную сілу, актывізавацца і накіраваць свае намаганні ў канкрэтнае рэчышча. У такім выпадку вы можаце атрымаць вынік у самыя кароткія тэрміны. У аўторак вас могуць падцікоўваць падман і прамашкі, не спакушайцеся поспехам у фінансавых справах і бізнесе. Варта быць асцярожнымі з новымі сябрамі, яны часцей не дагаворваюць. У чацвер лепш нічога не пачынаць, займіце чакальную пазіцыю і паступайце абдумана і мудра. У суботу давядзецца адстойваць свае погляды і інтарэсы.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні ваш план выйдуць праблемы асабістага характару і сямейныя справы. Могуць узнікнуць некаторыя перашкоды ў ажыццяўленні вашых рамантычных планаў. Для вас можа апынуцца непасільнай задачай кантраляваць сітуацыю. У дзелавой сферы праца абяцае быць пераважна руціннай, аднак цалкам магчыма, што з'явіцца новае кола абавязкаў. Спрыяльны час для падрыхтоўкі да развіцця новай справы. У выхадныя магчымы праблемы з дзецьмі, якія вылыюцца ў буйныя выдаткі.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** У панядзелак верагодная цікавая дзелавая паездка, якая дазволіць пашырыць кола зносін і дасць новыя магчымасці ў будучыні. Паспрабуйце вучыцца слухаць і чуць навакольных, і вы запазычыце для сябе шмат цікавага і станеце мудрэйшым. Магчыма паляпшэнне сітуацыі ў прафесійных справах. Спрыяльны час для перамен у асабістым жыцці. Паспрабуйце па-філасофску паставіцца да ўнутранага напружання, яно будзе толькі пабочным эфектам сабранасці, якая спатрэбіцца для дасягнення мэт.



**СКАРПІЁН.** Настае спрыяльны час для пазітыўных перамен. Адкіньце прэч няўпэўненасць і сумненні і пачынайце адстойваць свае правы на ўсіх жыццёва важных напрамках. У пачатку тыдня вам вернуць усе даўгі і зробяць перспектыўныя дзелавыя прапановы. Ваші ідэі будуць запатрабаваны сярод калег і начальства. У нядзелю сябры ці родныя папросяць дапамагчы разабрацца з цяжкавырашальнай праблемай. А вось для праявы моцных пачуццяў або гарачых эмоцый, а таксама для новых знаёмстваў тыдзень не вельмі добры.



**СТРАЛЕЦ.** У вашых сілах зрабіць максімум магчымага ў розных галінах. Не бойцеся браць на сябе дадатковыя абавязацельствы. Паспрабуйце пазбягаць канфліктаў і супярэчнасцяў у адносінах з калегамі і начальствам. Будзьце гатовыя да карэкціроўкі планаў. Вашы творчыя ідэі своечасовыя і неабходныя, таму і настрой будзе на вышыні. Паспрабуйце распраўіцца з няскончанай манатоннай працай. У выніку адчуеце палёгку і ўбачыце сітуацыю з іншага боку. Нядзеля можа апынуцца днём роздуму — аб мінулым, будучыні, і вашым удзеле ў гэтым.



**КАЗЯРОГ.** Будзеце гатовыя працаваць без выхадных. Аднак варта злёгку астудзіць такую стараннасць і рэальна разлічыць свае сілы. Можаце не сумнявацца ў надзейнасці і шчырасці партнёраў. Арыентуйцеся на іх, і гэта прынясе жаданы поспех. Паспрабуйце быць больш пунктуальнымі, не спазняцца і выконваць узятыя на сябе абавязацельствы. Спрыяльны тыдзень для наладжвання сувязяў з замежнымі партнёрамі, абнаўлення крыніц інфармацыі. У выхадныя арганізуйце сустрэчу з сябрамі.



**ВАДАЛЕЙ.** Пачатак тыдня можа аказацца выпрабаваннем на трываласць, але да серады напружанне спадзе і хмары адкрыюць ласкавае сонейка. Проста трэба верыць ва ўласныя сілы і шчырасць блізкіх людзей. У чацвер магчымыя цікавыя сустрэчы і выгадныя прапановы, будуць запатрабаванымі вашы лепшыя якасці і аналітычны розум. У канцы тыдня вас можа чакаць падзея, якой адзначыцца пачатак поспеху ў кар'еры. Верагодныя станоўчыя зрухі ў асабістым жыцці. Будзьце больш уважлівыя да патрэб каханага чалавека і не спяшайцеся рабіць нейкія высновы.



**РЫБЫ.** Найбліжэйшыя дні абяцаюць быць даволі дынамічнымі і напружанымі, давядзецца разбірацца з неадкладнымі праблемамі, магчымая празмерная загружанасць на рабоце. У сярэдзіне тыдня да ўсяго іншага могуць дадацца праблемы з мінулага, без вырашэння якіх не будзе прасоўвання наперад. Спатрэбяцца тытанічныя намаганні, каб праўрацца. У якасці ўзнагароды ў пятніцу прадставіцца шанц творча і вельмі прадуктыўна рэалізаваць свае планы і задумы.

## Чацвер, 2 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Стрэчання Гасподняга.
**9.10** Нашы.
**9.25, 22.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Ліст чакання».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Буйным планам.
